волшебный свет» Персональная выставка художника Леонида Ротько в Бресте / А. Рыбачук // Вечерний Брест. – 2016. – 30 августа.
10. Сарычев, В. Хозяйка доброго дракона / В. Сарычев // Вечерний Брест. – 2016. – 6 октября.
11. Седнев, А. Почетный консул Франции подарил Бресту работы Якова Балглея / А. Седнев // Вечерний Брест. – 2015. – 28 сентября.
12. Соколовская, Е. Выставка молодых художников «Усе разам-3» открылась в Бресте / Е. Соколовская // Заря. – 2016. – 9 марта.
13. Хомякова, А. На выставке эмали в Испании представлены работы брестского художника Николая Кузьмича / А. Хомякова // Вечерний Брест. – 2016. – 23 июня.
14. Шатило, И. В Бресте работает выставка Николая Кузьмича / И. Шатило // Брестская газета. – 2015. – 3 декабря.
15. Шатило, И. В Бресте работает выставка «Классика пейзажа» / И. Шатило // Брестская газета. – 2016. – 13 мая.
16. Ярмошук, Н. В Бресте представили картины Д. Стеллецкого» / Н. Ярмошук // Заря. – 2015. – 28 августа.
17. Яценюк, С. Художник Лев Алимов: «Я просто рисую – и все» / С. Яценюк // Вечерний Брест. – 2016. – 4 мая.
18. Яценюк, Граффити с цитатой и портретом Якуба Коласа появится в Бресте / С. Яценюк // Вечерний Брест. – 2016. – 29 августа.
19. Яценюк, С. Брестская художница Мария Редько участвует в создании фильма о жизни Ван Гога / С. Яценюк // Вечерний Брест. – 2016. – 2 сентября.
20. Городской портал Бреста: исторические статьи и фотогалерея [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.virtualbrest.by. – Дата доступа : 10.10.2016.

## ПАДЫХОДЫ ДА ВЫЗНАЧЭННЯ ПАНЯЦЦЯЎ «ПРАЕКТ», «ПРАЕКТАВАННЕ» У ГУМАНІТАРНЫХ НАВУКАХ

**Лапотка К. А.**
*магістр культуралогіі, вядучы метадыст Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, аспірант кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*

***Аннотация***. *В статье автором характеризуются основные подходы к изучению понятий «проект» и «проектирование» в сфере гуманитарных наук.*
***Summary***. *In the article the author describes the main approaches to the study of the concepts «project» and «design» in the humanities.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэсы і змены якія адбываюцца ў сучасным грамадстве непазбежна адлюстроўваюцца на дзейнасці чалавека. Значная колькасць практык набывае асаблівыя характарыстыкі і алгарытмы ажыццяўлення. Гэта тлумачыцца ўзрастаючай хуткасцю жыцця сучаснага чалавека. Шмат дзеянняў, якія мелі важнасць раней, зараз становяцца нязручнымі і адкідваюцца з-за іх састарэння. Чалавецтва актыўна працуе над стварэннем больш эфектыўных тэхнік і тэхналогій, якія пры выкарыстанні дазволяць сэканоміць значную колькасць часу і рэсурсаў і прыкметна спросцяць выкананне пэўных функцый.

Можна заўважыць адзначаныя заканамернаці не толькі ў сферы дзейнасці чалавека, якая накіравана на фізічнае пераўтварэнне рэчаіснасці, але і ў сферах, якія не заўсёды могуць паддацца матэрыяльнаму вымярэнню. Чалавек шукае эфектыўныя

тэхналогіі для выкарыстання ў сферы культуры, непасрэдна ў мастацтве і ўвогуле ў культуратворчасці і ў сферы асабістага жыцця. Шматлікімі мысліцелямі даволі часта выказваюцца думкі аб магчымасці планавання свайго жыцця. Ці як яшчэ кажуць праектавання.

Тэрміны «праект» і «праектаванне» з'явіліся ў тэхнічнай сферы дзейнасці чалавека. Першапачаткова ўжываліся адносна архітэктурных праектаў ці іншых аб'ектаў, якія ў перспектыве маглі атрымаць сваё фізічнае ўвасабленне. Але з цягам часу цікавасць да праектавання як тэхналогіі, распаўсюдзілася на ішыя сферы жыццядзейнасці. Стварэнне праектаў і праектаванне пэўных аб'ектаў і працэсаў застаецца актуальнай з'явай паўсядзеннасці сучаснага чалавека незалежна ад яго сферы дзейнасці.

У сучасных гуманітарных навуках існуе шэрах падыходаў да вызначэння паняццяў «праект» і «праектаванне». У іх аснову пакладзена агульная рыса разумення гэтай з'явы. Адно з найбольш агульных вызначэнняў можна сустрэць у Савецкім энцыклапедычным слоўніку. Вызначэнне тэрміна «праект» наступнае: «(ад лат. projectus – кінуты наперад) 1) сукупнасць дакументаў (разлікаў, чарцяжоў) для стварэння якіх-небудзь збудаванняў ці вырабаў; 2) папярэдні тэкст якога небудзь дакумента; 3) задума, план» [5, с. 1076]. На гэтай жа старонцы даецца вызначэнне «праектаванню». «Праектаванне – працэс стварэння праекта, прататыпа, правобраза меркаванага ці магчымага аб'екта, стану. Нароўні з традыцыйнымі відамі (архітэктурна-будаўнічым, машынабудаўнічым, тэхналагічным і інш.) пачалі складвацца самастойныя накірункі праектавання чалавека-машынных сістэм, працоўныя працэсы, арганізацый, экалагічныя, сацыяльныя, інжэнерна-псіхалагічныя і іншыя» [5, с. 1076]. Праект разумецца як план, вобраз будучага стану сістэмы ці аб'екта. Мяркуецца, што працэс праектавання складаецца як мінімум з дзвюх частак. Перашая – гэта стварэнне правобраза аб'екта, падзеі ці стану, другая – распрацоўка тэхналогіі практычнага ажыццяўлення гэтага правобраза.

У агульным сэнсе праектаванне ўяўляе сабой мэтанакіраваную дзейнасць, вынікам якой з'яўляюцца канкрэтныя змены ў рэчаіснасці суб'екта, які яе ажыццяўляе.

Каб зразумець больш дакладна, што ёсць «праект» і «праектаванне», неабходна звярнуцца менавіта да саміх тэрмінаў. У філасофскай энцыклапедыі даецца наступнае вызначэнне: «1) прадукт дзейнасці праектавання; 2) арганізацыя кааператыўных форм дзейнасці; 3) адно з паняццяў экзістэнцыяльнай антрапалогіі. У першым сэнсе паняцце «праект» ужываецца ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя пры станаўленні машынабудаўнічага і архітэктурнага праектавання. У праекце распрацоўваюцца і рэпрэзентуюцца будова праектуемага аб'екта, схемы яго функцыянавання, а таксама асноўныя этапы і спосабы яго вырабу. Па матэрыялу праект уяўляе сабой чэрцяжы і разлікі, макеты і іншыя графічныя і тэкставыя матэрыялы, прадстаўленыя ці на паперы, ці ў электронным выглядзе. Праект гэта не толькі прадукт, але і сродак праектавання; пры яго распрацоўцы праектыроўшчык рэалізуе патрабаванні да аб'екта праектавання, стварае і параўноўвае варыянты праектных рашэнняў, узгадняе розныя планы і ўзроўні распрацоўкі аб'екта і г.д. У аксеалагічным дачыненні праект нясе ў сабе патэнцыю новага і каштоўнасці праектыроўшчыка. Ідэя праекта ў другой палове XX стагоддзя была абагульнена і распаўсюджана на формы арганізацыі дзейнасці, накіраванай на стварэнне розных вырабаў ці сістэм. Праект – цэнтральнае паняцце антрапалогіі і філасофіі гісторыі Ж.П. Сартра. Пасродкам праекта чалавек пераадольвае супярэчнасць паміж патрэбамі і светам, адмаўляе знешнюю інэртную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыю, «ставіцца да будучага аб'екта» які імкнецца выклікаць да быцця тое, чаго «яшчэ не было» [3, с. 359]. Дадзеннае вызначэнне, аўтарам якога з'яўляецца расійскі філосаф В.М. Розін, шматграннае і закранае розныя сферы ўжывання праектаў. Не засталося без увагі і непасрэдна культурны ці антрапалагічны бок дадзенай з'явы.

У філасофскім слоўніку 1999 года выдання даецца разгорнутае вызначэнне паняцця праект. У ім даюцца тлумачэнні неабходных кампанентаў і патрабаванняў для ажыццяўлення праекта. «Праект – прататып, праобраз аб'екта, які мяркуецца. Работа па стварэнню праекта патрабует, па-першае – ведаў аб аб'ектах праектавання і ведання аб прызначэнні і функцыянаванні сферы дзейнасці (рэчайснасці), у якую ўводзяцца аб'екты, якія пераўтварыліся; па-другое, веданне методык і паняційных сродкаў праектавання, як спецыфічнай дзейнасці. Гепатытычнае пераўтварэнне аб'екта звязана не толькі з дадзенасццю, але ўлічвае таксама магчымасць практычнага прывядзення існуючага аб'екта да такога выгляду, які задаецца ў праекце. Падставы, якія вызначаюць выбар накірунка пераўтварэнняў (ці ідэалы), павінны суадносіцца з шырокім кантэкстам сістэмы, у якую ўваходзяць аб'екты, якія змяняюцца. Пажаданая выява аб'екта разглядаецца ў якасці праекта ў тым выпадку, калі яно рэалізуецца ў выглядзе аб'екта ці можа быць рэалізавана. Ацэньванне праекта не з пункту гледжання праўдзівасці – памылковасці, але рэалізуемасці патрабуе ад аб'екта наяўнасці ўласцівасцей, якія паддаюцца непасрэднаму ўздзеянню таго, хто ажыццяўляе гэтыя пераўтварэнні, што фіксуюцца ў праекце. Заданне аб'екта пачынаецца з вылучэння працэсаў у гэтым аб'екце, перш за ўсё функцыі як ажыццяўлення пераўтварэнняў, якія ўводзяцца. Працэсы функцыянавання акрэсліваюць межы аб'екта праектавання як сістэмы. У адпаведнасці з атрыманым спосабам функцыянавання выбіраецца матэрыял, які яго забяспечвае. Спецыфічны парадак вылучэння і арганізацыі аб'екта характэрызуе структуру праектыўнага даследавання. Разуменне праекта як аднаго з вынікаў метадалагічнай работы, якой ахопліваюцца пазнавальная, практычная, арганізацыйна-кіраўнічая дзейнасці, распаўсюджвае прынцыпы праектавання на навуковае даследаванне як такое, што прыводзіць да змены тыпа аб'ектаў, якімі валодае навука і змяненню структуры навуковага пазнання» [4 , с. 802].

Больш новыя выданні філасофскіх слоўнікаў таксама ўтрымліваюць вызначэнні паняццяў «праект» і «праектаванне», але яны канцэнтруюць увагу на іншых асаблівасцях. Мы мяркуем, што аспекты на якіх аўтары засярodзілі ўвагу, з'яўляюцца актуальнымі для сучаснасці і ў нейкім родзе яе тлумачаць. Згодна кароткай энцыклапедыі філасофіі, навукі праект – гэта «кагнітыўная канструкцыя нейкага будучага прадмета – артэфакт чалавечай дзейнасці, які ўвасабляе ў сабе пэўныя, часта пажаданыя для чалавека ўласцівасці, адносіны, функцыі. Самым масавым відам праектаў у сучаснай чалавечай дзейнасці з'яўляецца стварэнне кагнітыўных мадэляў будучых спажывецкіх коштаў (тавары масавага попыту), а таксама рознага роду тэхнічных, тэхналагічных і сацыяльных сістэм. Аднак, у якасці найпростага віда праекта можа разглядацца і любое жаданне, мэта, мара, як магчымая будучыня» [6, с. 513].

У гэтым жа слоўніку даецца і вызначэнне паняццю «праектаванне». Яно вызначаецца наступным чынам: «Праектаванне – гэта працэс стварэння праектаў, а таксама абгрунтаванне іх карыснасці, надзейнасці, канструктыўнай мэтазгоднасці, эканамічнай эфектыўнасці. У залежнасці ад зместу праектаў і метадаў іх абгрунтавання, праектаванне адрозніваюць па відах: штодзеннае, навуковае, тэхнічнае, тэхналагічнае, інжынернае, будаўніча-архітэктурнае, сацыяльнае,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экалагічнае, цывілізацыйнае, кароткатэрміновае, сярэднетэрміновае, аддалена-перспектыўнае і інш. Праектаванне істотна адрозніваецца ад прагназавання. Першае – стварэнне новай магчымай будучыні і дзеянне па яго наступнаму ўвасабленню, другое – экстрапаляцыя ўжо вядомых тэндэнцый і заканамернасцяў аб'ектаў на будучы стан як паўтарэнне мінулага ва ўсіх яго галоўных якасных характарыстыках» [6, с. 513].

У асобны накірунак вылучаецца навуковае праектаванне. У энцыклапедыі «Філасофія навукі» яно вызначаецца, як «… адзін з найважнейшых метадаў, асабліва ў тэхнічных і тэхналагічных навуках (тэхнічнае і тэхналагічнае праектаванне), сацыяльных навуках (сацыяльнае праектаванне), вылічальнай матэматыцы (камп'ютарнае мадэляванне і праектаванне). У аснове любога віда навуковага праектавання ляжыць паняцце «праекта» як мадэлі будучага артэфакта (машыны, механізма, архітэктурнага і будаўнічага аб'екта, тэхналагічнага працэсу, новага тавара ці паслугі, сацыяльнай сістэмы, прыродных сістэм, семіятычных сістэм, прадметаў віртуальнай рэчаіснасці і інш.). Любы праект уяўляе сабой складаную мадэль, у якой шмат параметраў будучай рэчаіснасці, якая павінна паспяхова функцыянаваць як цэлае ў адзінстве і ўзаемасувязі ўсіх кампанентаў (часта якасна розных, супярэчных адзін аднаму ў сваіх канкрэтных уласцівасцях). Стварэнне навуковага праекта ўяўляе сабой складаны і многаступенны працэс разліка магчымасці, рэальнай здзяйсняльнасці, надзейнасці і эфектыўнасці функцыянавання, як кожнага асобнага элемента (блока) праектаванай сістэмы, так і сістэмы ў цэлым. Да падобнага роду разлікаў выкарыстоўваюцца веды фундаментальных навуковых тэорый (фізічных, хімічных, біялагічных, сацыяльных, экалагічных і г.д.), тэхнічных і тэхналагічных навук агульнага і прыватнага характару, назапашаны досвед навуковага і інжынернага праектавання ў розных сферах, экспертныя заключэнні розных навуковых камісій. Важнай і неабходнай умовай прыняцця навуковага праекта з'яўляецца яго матэматычнае мадэляванне і рэальнае выпрабаванне. Канчатковае зацвярджэнне па яго навуковай абгрунтаванасці і практычнай мэтазгоднасці любога праекта выносіцца адпаведным экспертным саветам у які ўваходзяць спецыялісты высокага ўзроўня ў розных галінах навукі, якія маюць дачыненне да праекта, а таксама прадстаўнікі менеджмента, маркетынгавых структур, а ў некаторых выпадках і грамадскасці, асабліва калі праекты тычацца здароўя і бяспекі людзей. Рашэнне эксперных саветаў уяўляе сабой кансэнсуальны вынік складаных навуковых і сацыяльных перамоваў іх удзельнікаў» [6, с. 464].

Як адзначаецца ў пачатку гэтага вызначэння «праектаванне – адзін з найважнейшых метадаў асабліва ў … сацыяльных навуках (сацыяльнае праектаванне)…». Гэта зацвярджэнне мае пад сабой падставу таму, што сацыяльнае праектаванне ў канцы ХХ стагоддзя складваецца ў асобную галіну даследаванняў і практыкі. Таму мы маем яшчэ адзін накірунак развіцця праектавання ў гуманітарных навуках. Даследчыкі, якія займаюцца вывучэннем сацыяльнага праектавання, даволі часта атаясамліваюць сацыяльнае праектаванне з праектаваннем культуры. Таксама можна сустрэць ужыванне гэтых паняццяў як сінонімаў, ці формы «сацыякультурнае праектаванне».

Тым не менш, прыхільнікі дадзенага накірунку даследаванняў таксама робяць спробы даць вызначэнне паняццям «праект», «праектаванне». Даследчык І.І. Ляхаў піша, што праектаванне – гэта працэс стварэння праекта-прататыпа, праобраза меркаванага і магчымага аб'екта, стану [2] ці на думку І.В Бестужава-Лады, канкрэтная мадэль аптымальных форм будучыні [1]. Тым не менш, увага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследчыкаў сацыяльнага ці сацыякультурнага праектавання засяроджана на спробах даць тлумачэнне непасрэдна гэтага тыпу праектавання. Таму становіцца немагчымым выяўляць у працах, прысвечаных сацыяльнаму, сацыякультурнаму праектаванню ўніверсальных паняццяў. Усе яны даюцца менавіта ў сацыяльным, сацыякультурным кантэксце, што з'яўляецца асобнай сферай даследаванняў.


1. Бестужев-Лада, И.В. Поисковое социальное прогнозирование: перспективные проблемы общества: Опыт систематизации / И. В. Бестужев-Лада. – М. : Наука, 1984. – 271 с.
2. Ляхов, И. И. Социальное конструирование / И. И. Ляхов. – М., 1981.
3. Новая философская энциклопедия : В 4 т. / гл. ред. В. С. Степина.– М. : Мысль, 2001. – Т. 3. – 692 с.
4. Новейший философский словарь / гл. ред. А. А. Грицанова. – Минск : Книжный дом, 1999. – 896 с.
5. Советский энциклопедический словарь / гл. ред. А. М. Прохоров. – 4-е изд. – М. : Сов. энциклопедия, 1989. – 1632 с.
6. Философия науки : краткая энциклопедия (основные направления, концепции, категории). Научное издание / гл. ред. С. А. Лебедев. – М. : Академический Проект, 2008. – 692 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КУЛЬТУРНЫЙ СТАНДАРТ КИТАЯ


**Лебедева Д. В.**
*старший преподаватель кафедры иностранных языков*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств (г. Минск)*



***Аннотация***. *Статья посвящена проблемам межкультурной коммуникации в сфере бизнеса в КНР. Основным понятием является «культурный стандарт» как совокупность исторически обусловленных норм поведения.*

***Summary***. *The article is devoted to the problems in intercultural business communication. It describes the «Cultural Standard» of China including seven main features, which are significant from the European point of view.*


Результаты исследования множества конфликтных ситуаций, недоразумений и причин возникновения негативных эмоций в общении между представителями разных культур указывают на наличие у собеседников из разных стран отличающихся эмоциональных, социальных и мировоззренческих установок, сквозь призму которых происходит восприятие и интерпретация информации. Немецкий профессор, доктор философии и преподаватель социальной психологии университета г. Регенсбург А. Томас в своих работах называет набор таких установок «Культурным стандартом» [1, с. 24]. Культурный стандарт описывает в виде тезисов особенности восприятия, мышления, оценки и действия, типичные для большинства представителей определенной культуры. Ориентируясь на эти признаки, они оценивают свое собственное и чужое поведение как «нормальное и обязательное», если оно остается в рамках стандарта, или отвергают как «неподобающее», если стандарт нарушен.

Китай, одна из крупнейших стран мира, имеет тысячелетнюю самобытную историю и давние традиции, уходящие корнями в конфуцианство – основное философское учение, существующее с V века до Р. Х. Под влиянием учения Конфуция и других китайских философов (Мэн-цзы (IV в.) и Лао-цзы (VI в.))